БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоўская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаўкай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пятыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 кап.

[Шта]тодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 4. Менск. Серада 27 сакавіка 1918 г. Год I.

Грамадзяне!

Камітэт грамадзкой абязпекі [п]ры Менскай Гарадзкой Думе [3]1-го сакавіка (марца) новаго [с]тылю ладзіць скарбоначны збор на карысьць асобаў, [па]стаўшыхся ў цяжкім палажэньні ў Менску.

Грамадзяне! Камітэту патрэбны людзі для збору ахфяраў, патрэбны і самыя ахвяры.

Тым, ці іншым спосабам [до]памажыце, грамадзяне, ў гэты дзень.

Запісывацца у зборшчыкі можна што дня ад 10—4 гадз. дня у Гарадзкой Управе (на рагу Юрэўскай і Губэрнатарскай вул.); там жэ прыймаюць [гро]шы і ахвяры.

Камітэт грамадзской абязпекі пры Менскай Гарадзкой Думе.

Менск 27/III.

Зіму і восень гаварылі [га]ры. Першае веснавое со[нца] ... пачалі а 4 гадз. на ам... [ска]кім фронце у Францыі ... вельмым гулам тысячаў гэ... [фран]скіх гарматаў, каторыя ... гадзін і 40 мін. усе зьму... [з]лічап. Германская па... пайшла у атаку, а за ей у... пасунуліся у помач гэ... уселякая страляючая [ар]тылерыя. На 80 кілём. гэтцы [ан]глінам прарвалі 3 лініі... таў, і так далёка усун..., што награжаюць зах... ... французам, якіе трымаць фронт правей ангілійцаў...

Бой ідзець ужо ... сезен. Абстраліваюць ужо ф... Парыжу, але форты ідуць... пер... пяпём у вокал го... на вельмі далёкай дыстан...

Два глаўные парт... вайны—Германія і Англ... адкідаўшы слова аб зго... сха... ... за мячы, можа ... астатняй бітве. Раздз... між сабою цэлы сьвет, ... на другое месцо. ... падзяліць ў гару,—сла... відаць, ... сгаворыліся.

Адзін бытны ... русьнік ... уладыкі акіянаў— ...—Расія зыйшла с пол... разсыпалася на кавалкі. ... мыкілася Ангія на Расі... ладзючы на глаўную надзею: ў самы важ[ны] момэнт гэты козыр аказаў[ся] пустой бальшэвіцкай «м...кай». Амэрыканцы аказа[лі]ся так сама слабым козырам, яны выбыўшых са строю Ра[сію] і Румынію ні замянілі. К... войстьвенаму саюзу удасц... [з]ламаць французскі фронт, т[а]йна можа і скора сконча[ецца].

[М]ы, сьведкі гэтаго астатняго [бою] двух ўсесьветных волатоў, [ба]чем як менш значучай [ста]ецца воля другіх нацыяў і ... у справах свайго быту, [св]оей долі. Усе больш вы... [ст]ецца, што яна будзе заляжаць ад таго, чым скончыцца [бой]. Залежна ад яе рэзульт[ат]у перарабіцца увесь сьвет. ... адчуваць гэтаго могуць ... толькі шчасьлівые дзяцёнкі, ... ймака, у расейскай «гаварыль[н]і», ад якой наша Беларусь патроху прыходзіць ужо да памяці.

«Брацьця! Памаўчым, сягоння вялікі дзень»—сказаў некалі адзін сьвяты. Мы скажым: досыць гугаркі, беларусы, барэмося за сваю працу.

Доля Беларусаў.

Літва з Вільняй аб'яўляны Гэрманіяй «вольнай і нізалежнай дзержавай» у саюзе з Гэрманіей, каторая споўніла такім чынам бажанне Краёвай Літоўскай Рады ад 11 сьнежня 1917 году. Літва павінна прыняць на сябе помач гэрманцам у вайне.

Пад знакам вайны зрабілася, як мы бачым, так званая, Малая Літва, ў каторую ўвайшла часьць беларускай віленшчыны з беларуска-літоўскай сталіцай нашай—Вільняй. Ідэя адбудаваньня гістарычнай Вялікай Літвы разляцелася, як дым, а кавалак Беларусі—самы культурны—ўжо адрэзаны і можа мець сваю гісторыю.

Новаакупіраванная Беларусь да Полацку, Оршы і Гомялю тым часам знайходзіцца на другіх правох. Доля яе залежыць ад Вялікаросіі, Гэрманіі і Украіны. Украіна забрала ўжо паўднёвую часьць Міншчыны і Гродзеншчыны. Да Польшчы так сама можа адыйсьці частка Гродзеншчыны. Малая Літва першай дастала фармальна часьць Беларушчыны.

Беларусь і Літва есьць адін эканамічны натуральны арганізм і разам стварылі яны некалі адну дзержаву з мілай нашаму сэрцу самабытнай культурай, пераходнай ад заходу до усходу, каторая жыла векі і, мы верым, будзе жыць.

Астатняго слова іншчэ не сказана, наш дзержаўна-народны зьвязак з Літвой іншчэ не урэгуліраваны, але ён стаў на чародзе дня неатложна. Не зважаючы на тымчасовае памашматкованне беларускаго народу, мы лічым сабе едзінай, недзялімай Беларусіяй. І каб захаваць гэту суцэльнасьць, мы, аткінуўшы іншые, павінны з'еднацца на націянальным пункце.

Скрыпты шовініста.

«Мы жылі палавінным жыццем, трымаліся ў дзеяльнасьці палавічных спосабаў і мелі сярод сябе агромны лік поў-палякоў». Час поў жыцця, поў—спосабаў, прамінуў. Цяпер трэба «ясна думаць, горача пачуваць, у паступках быць пэўным і піуломным». Для гэтаго трэба мець сьвядомасьць, хто ты і што. Звычайво на запытанне «хто ты?» «на крэсах нашых ні многія атказвалі ясна і коратка: я паляк!» Замест такога атказу, каторы сам сабою з'яўляецца цэлай праграмай працы ў гэтым краю, шмат хто абзначаў сябе нічога ні значучым імем «тутэйшаго» «Другіе дастаўшы з сямейных архіваў беларускіе дакумэнты тлумачыліся, што з роду яны беларусы, а культуру маюць польскую». У цяперашны момэнт «мусім перэлічыць свае рады,... ведаць хто з нас і колькі з нас стане са шчырай, гольскай, блізкай сабе працы» «А поўпалякі ніхай скінуць маскі і адступяць ад сьвятой справы».

Гэта—з артыкулу п. М. Даманскай у № 46 «Дзенніка Мінскаго».

* * *

Якія добрые, праўдзівые, патріотычные мысьлі! Каб замест слоў «паляк, палякі» падставіць «беларус, беларусы», то можна было-б з'архітэктонізаваць пекны артыкул на балючую беларускую тэму.

Сапраўды вам трэба каб усе гэтые палавічнікі яшчэ раз пераглядзелі свае старые «беларускіе дакумэнты», мэтрыкі і формуляры і хоць адзін раз у своём жыцці шчыра і атрыта сказалі, кім яны ёсьць. Уласных, кроўных сваіх «спагадачоў» толькі нам цяпер ні трэба. «Хай... адступяць ад сьвятой справы» і, найлепей, едуць аздабляць сабою Варшаўскіе і Маскаўскіе,—залежне ад культуры—брукі.

«Баба з калёс,—каню лягчэй».

А. Новадворскі.

Крыжы.

Абапал дарогі, каля крушняў, пад сухімі бярозкамі стаяць крыжы. І вялікіе і малые. Часам у адзіноцці, часам радкамі-сямейкамі. На крыжох, дзе ні дзе, бліш[ч]ыць воркалёвая істужачка, часам—убогі абразок Маткі Божай, з часам чорнае заржаўлевае Распяцце.

Крыжы... Куды ні кінь вокам—усё крыжы...

Гэта сьлед уцекачоў 1915 г... уцекачоў з Гродзеншчыны, Віленшчыны, Міншчыны...

Выгнаные з родных куткоў, галодные, халодные, цягнуліся яны упярод, хто на коніку, а хто пехатой, с клумкамі за плячыма, з грудымі дзецьмі на руках...

Цягнуліся упярод, ні маючы ніякаго прытулку. А за імі гналіся полымя, гібель, сьмерць. Крыжамі азнача[лі] праўдзёны імі шлях.

Крыжы...

Гэта вялікая людская пакута выводзіла крывавымі крыжамі ... сьвецьце ... запісала ... ... надтагіс на халодных грудзях роднай зямелькі.

Плакала зямля-маці сьлезамі восені—падаў на галовы старых і малых халодны марозлівы густы дождж. А ў начы вецяр-віхор насіўся над імі, стагнаў, выў, галасіў...

Сьлёзы людзей мешаліся с гразью па вялікіх дарогах. Стогны іхныя глушыў лістападавы вецяр і абяздоляннасьць застыгла у вачах людскіх.

А у змроках, у вільготных туманох крыжы расьлі абапал дарогі...

* * *

І людзі расплываліся-рассяваліся па вялікіх чужых гарадох. Маткі гублялі сваіх дзяцей. Дзеці ні ведалі, дзе іх бацькі і папаўнялі яны ўсе пошэсьцьные шпіталі. Было мала і іншчэ дабудовывалі. Выстаівалі яны на марозі, па вуліцах цэлымі днямі, чакаючы «пайкоў».

Людзі патроху сжываліся с горам і захавалі уцекачы пакуту глыбока-глыбока ў душах сваіх.

І да іх усе патроху прывыкалі — прывыкалі да гэтых бледных людзей ў лапцёх, ў грубых сьвітках...

З душных, цесных байракаў вазілі іх на гарадзкія могліцы...

Лясы белых, сасновых крыжоў, захопліваючы новые і новые абшары, красаваліся на сьвежых жоўтых пагорках.

Крыжы...

І ні страшна было, і ні жаласна, бо ў кожнаго было сваё горо, былі свае крыжы.

* * *

Сядзіць стары дзед з белай, як сьнег, барадой, з бляскам роднаго, беларускаго неба ў выцьвіўшых вачох—у адзінацці сядзіць—ў глухім, цёмным кутку бруднаго байраку. Ні рухомы, паважны, як высечаная с каменя постаць натхнёнаго прарока. Ні распытывай, ні чапай яго—ён марыць... марыць аб сваім родным кутку.

Гудзіць, шумць ... ...аго ... ... гаворка...

люецца перад ім, атуляное пазалотаю слонейка, жытняе поле, апырсканае сінімі зоркамі васількоў... І вабіць яго стары бацька Нёман...

На адну хвіліну крыжы фарбуюцца ў яго душы чароўнымі праменямі роднаго слонка.

Ні будзі яго... Ні будзі яго ад шчаслівых таёмных мараў, ні выклікай тых цёмных крыжоў жыцця з яго сэрца...

З. Бядуля.

Ішчэ аб нацыянальнай школе.

Наша беларуская інтэлігенція, што залічае сябе то да польскай то да расійскай культуры і цяпер, дзякуючы грамадзкой і эканамічнай руйнацыі краю, знайходзіцца у цяжкім стані ні ведаючы і ні маючы што рабіць,—павінна у канцы апомніцца.

Перад ей,—вагромністая ніва праудзівай народнай, нацыянальнай, прасьветы і культуры.

Частка інтэлігенцыі, здольная да прасьветнай працы, павінна зараз-ж узяцца за яе, паставіушы сабе ідэалам нацыянальную беларускую школу, у якой усе навукі выкладаліся-б па беларуску і было-б навучанне і чужых мовау: польскай, рускай, нямецкай і інш..

У пачатковых школах можна было б пачынаць зараз жэ усе выклады па беларуску. Вучэбнікі у нас ужо есьць, і толькі іх трэба надрукаваць у значнуй лічбі. Калі б якіх ні выстарчыло, і ніхто з беларусау ні узяуся пісаць іх, дык можна было бы пераклaсьці лепшыя падручнікі с чужых мовау. Цяпер, калі нашымі блізкімі суседзямі будуць і немцы, нам канечне патрэбны слоунік нямецка - беларускі і беларуска-нямецкі.

Калі у сярэдняй школі ні можна усяго выкладаць па беларуску, дык прынамсі трэба грунтоуна вучыць усе, што дотыкаецца беларусау: гісторыю, геаграфію, жыцце, старую пісьменнасьць, цяперашнюю пісьменнасьць, народную творчасьць. Вышэйшая школа павінна мець катэдру беларусазнауства, на якой будзе разгледацца мова грунтоуна і навучна.

Прауда што доугія часы ідэалы той часьці інтэлігенцыі адцягіваліся на Кракоу ці Маскву і ні усе яе прадстаунікі здолалі-б адразу узяцца за навучанне, але была б толькіахвота! Трэба самім вучыцца і працаваць разам, каб такім парадкам будучыя пакаленні ні ведалі ганебнаго чужацтва уласнаму народу.

А. Данілевіч.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

У мешчанскай управе.

На 1 лютаго мешчанская управа выклікала камісію дзеля ліквідацыі спрау, бо пасьля скасавання між-становых адгародак гэта інстытуцыя, стаушыся ні да чаго ніпатрэбнай павінна была адыйсьці як нейкі padатак да месцовай управы.

Бальшэвіцкі камисарыят за... краю дакляраваў навыдаць „на хаутуры" мешчанскай управе суму, патрэбную для расплаты з служачыми.

Але зьмена сітуацыі—уцек бальшэвікоу, аккупацыя,—як бы устрыкнули морфіну у цела жывога трупняку, які і да гэтых час ні можа ішчэ сканаць на радасць і уцеху мешчанских вадзіраяу, нічым ні карысных грамадзянству уласным „самохарчаваннем".

За пашпартамі у мешчанскую управу цяпер рэдко хто прыходзіць, бо усе спадзяюцца скасавання пашпартнай сыстэмы і яна, нікому ніпатрэбная, толькі атручвае паветра сваім архаічным смродам, займаючыся як 100 гадоу таму назад зьбіраннем «манэты» пры выдачы пашпартоу і выбіваннем нідаімак за мінулыя гады.

«Персонал» управы сядзіць, па яго славам, бэз усякіх сродкау, сам добра ведаючы сваю ніпатрэбнасьць. Аб ніпрыдатнасьці ні ца чаго гэтай „інстытуцыі" сьведчыць і тоя, што месцовая управа ні вельмі ахвоча у данны момэнт, каб прыняць усе яе, кепскай памяці, «дзела».

А шкодлівасьць яе для мешчанскіх «нізоу» паказваецца хаця-б фактам, што цягасьць падаткау найчасьцей клалася на бяднейшых грамадзян: вазьнікоу, рамесьнікоу, землярабау, а ні на «прадстаунікау»—пяцідворных дэпутатау. «Рука руку мые»—і мешчанскіе заправілы стараліся дагадзіць дэпутатам сьмелыя, што рука астальнай „драбнаты" да іх ні дацягнецца.

Сьвядомые мешчане дауно ужо чакалі абнаулення жыцця, але нічога ні маглі падзеяць з тым, што выборы цяперашняй управы рабіліся амэрыканскім способам.

—Хутчэй панове! Сьмым сябе скасаваць для вас будзе лепей

Школьныя справы.

Школьная камісія пры гарадзкой управе адчыняе дзьве безплатныя агульно-науковые школы, куды будуць прыймацца дзеучаты і хлопцы, ад 16-ці гадоу. Лекцыі будуць вячэрнія, паміж імі ні чутно толькі нічога а беларусознаустве,—а пара мінчанам аб гэтым ведаць...

Безработные інтэлігенты арганізавалі мэханічную і агародную арцелі. Земство мае даць гаспадарскія машыны і кавалак зямлі пад агарады, а гарадская управа—насенне і таксама зямлю. Справа вельмі важная і добрая, нехват толькі грошы на пачатковые выдаткі.

Тэхнікі і інжэнеры маняцца адкрыць тэхнічную школу з аддзелам мэханічнай майстэрні дзеля папраукі гаспадарскіх машын і інш. Заняліся гэтым інжэнеры Дубах, Алексееу, Іонін, Новікоу і Пальцэу.

Сэкратарство у Гар. Управе пайшло з рук у рукі: сьперша Ерохова падмяніу Позьняк, цяпер Позьняка падменяе Андрэеу. Гэты апошні найбольш падхадзячы да цяперашняго настрою думы—з яе ясна-радыкальным напрамкам. Новы сэкратар — юрыст з Вільні, прыхільнік для беларускай справы.

Пазычковая касса пры упрауленні Л.-Р. ж. д. на выпадак ліквідацыі усіх аддзелау упраулення сьпешна узялася за падлік усіх вычатау, укладау і іншых падрахункау служачых.

Начальнік дарожных работ пры X арміі зрабіу заяву ваенна-палевому кантралеру Арлову, што іон ні можа даць грашавога атчоту, бо упрауленне перш было занято польскімі легіанэрамі, а пасьля немцамі.

Цікауна, як жа цяпер будзе с тымі грашыма (больш 8000 руб.), якія былі здадзены упрауленням „Начраба" X арміі атрадным інжынерам для расплаты с служачымі і рабочымі?

Упрауленне Л. Р. ж. д. па апошнім чуткам маняцца перавесці у Гомель. Немцы на гэта згаджаюцца і нат выдалі пазваленне агентам дарогі паехаць на поудня купіць харчы для служачых упраулення.

Пэнсіі афіцэрам і вайсковым чыноунікам ад № 501 да 1000 будуць выплачываць сягоння—27-го сакавіка у «рускім афіцэрскім бюро») Петропаулоуская вул. № 50).

Служачым губэрнскаго Камітэту У. З. С. пэнсіі за люты (февраль) ішчэ не заплачано, а толькі сутачные, а за сакавік—і гэтаго не далі.

Служачым у канцэлярыі Гор. Управы пэнсіі за сакавік выплачано кожнаму па 100 руб. Калі выплацяць рэшту німа ведама.

Сіроцкі суд, які бальшэвікі маніліся у апошні час разагнаць, ізноу узяуся за сваю працу. Цяпер ен належыць да цывільнаго адзелу Гар. Управы.

Губэрнскае земство арганізуе кніжные склады для сялянскіх школау і бібліатэкі для вучыцялеу.

Казначэйство пачало сваю працу во усіх аддзелах з 19 г. м.

Вузка-калейная жал. дарога можа у хуткім часі злучыць Мінск з «Іодковай Цной» (9 верст ад гораду па Даугінаускаму тракту). Справа гэтая для нашаго места вельмі важная, бо у Цне заарэндована 12 дзесяцін торфу, адкуль дастава яго шмат патанела-б. Праэкт гэты можа тым лягчэй прайсьці, што у Гомелі есьць 20 падхадзячых для гэтага вагончыкау, а цягаць іх маглі-б тымчасам каньмі.

Заразных хвароб за апошніе суткі было толькі два выпадкі—на Ляхоуцы і Магазыннай вул. (тыфус).

Цэны растуць у нас с кожным днем: хлеб дайшоу ужо да 1 р. 70 к. за хунт; дзесяток яяц—5 р. 50 к., масла—12 руб. за хунт і г. д.

Наша рэчка пробавала ужо выступіць с сваіх берагоу, але ня усьпела ішчэ шкоды нарабыць, як мароз зноу уціснуу яе на свае мейсца.

Ліст у рэдакцыю.

У Менскіх газэтах ад 25-го сакавіка быў надрукован ліст ад Прэдстаўніцтва з маім падпісам. Заяўляю, што гэты ліст быў пушчан у сьвет без майго распараджэння.

А. Уласау.

ВАЙНА

Заход. У дпым прарягу вялікай бітвы у Франціі нашы вайска ме...чу.

З Фландрыі талії двінуліся дывізіі і мы уступілі з імі у гара... бітву. Яны былі пабіты. Арміі гэнэрала фон-Белова ...то) і Марвіца узялі з бою Вервільер, вёску Бэпэкур, Брьер, пэрэйшлі Анкр. Каля Альбэра англійскія вайска ... адкінуты па шырокім фронце. Мы прашлі дарогу Боп—Альбэр: Гэнэрал Гофакэр пэрэйшоу Сомму узьўшы выс...

Контр-атакі н...яцеля былі адбіты.

Армія ген. Гут... адкінула у гарачым бою непрыяцел... за дарогу Пэрон-Руа. Нуасна французскія рэзэрвы былі разьбіты. Бісі узялі ... стаім на высотах на поунач ад Нуаена. Пры гэтых ...ах нашы разведочные партыі многа памагалі.

Работай безупын... дабіліся яны узаёмнай зьвязі поплеч бьюшчыхся часьц...

Нашы жэлезнада...я войска скора паправілі усе збураныя дарогі.

Ад пачатку боя з... 93 непрыяцельскія аэрапланы і 6 шароу. Летчык Фо...хтботэп збіў свой 67 і 68 апараты. Лейтэнант Бо... свой 32, Лернэр свой 27. Гаумэр 23-і, лейтэнанты К... свой 22, і Туй 20.

Оружйй узято боль... 963. Больш 100 броневікоў лежаць у заваеванай ...е.

На астальным захо... фронце артыллерыйскі бой. Фронт умацовываец...а. Ф...ия Парыж абстрэліваецца.

На другіх фронтах ...зьмены.

У Беларуск...й кнігарні

Менск, Захар...кая вул. 24.

—(ПРАДАЮЦЦА ...ВЫЯ КНІГІ:)—

Задачнік для па...ковай школы

Г. Юрэіч.

NOWY LEMENTAR...a BIAŁARUSKICH DZIETAK. Układi i wydan... Janki Stankiewicza

ПЕРШАЯ ЧЫТАНК... Кніжыца для беларускіх дзяцей дзеля н...кі чытання. Злажыу В. Л а с т.

BIEŁARUSKI KALEN...R na 1918 hod.

NAŠY PIEŚNIRY. Lit...urna—socyalnyje narysy. Anton Nowina.

EKONOMIĆNAJA EW...UCIJA i BIEŁARUSKI RUCH. Referat. A...kiewić.

JAK PRAWILNA PISA...a BIEŁARUSKI Caść I. Ułažyŭ Ant. Łuckie...

BUTRYM NIAMIRA pjes... 2 aktach s proloham. Franciszk Olechnow...

KALIS. Pjesa u 2 aktac... Franciszk Olechnowicz.

ШТО БЫЛО і ШТО ПАВІ...А БЫЦЬ. Петра з Арленят.

Рэдактар **А. Прушынскі.**
Выдавецтва **Т-во «Заранка».**

Друкарня. А. Грынблята.